ЯКУБ МІСКО

✦

# ПРАВА НА БЯССМЕРЦЕ

«Жизнь, отданная народу. Статьи и речи С. О. Притыцкого, документы и воспоминания о нем». «Беларусь», 1978.

---

Можна без перабольшання сказаць, што кніга гэтая не пакіне абыякавым ніводнага чытача. Яна пра Сяргея Восіпавіча Прытыцкага. Пра народнага героя. Пра чалавека, усё жыццё якога было насычана выдатнымі, слаўнымі справамі. Чыя партыйная і дзяржаўная дзейнасць — яскравы, захапляючы прыклад беззапаветнага служэння высакародным ідэалам камунізму. У кнізе сабраны артыкулы і прамовы Сяргея Восіпавіча, дакументы і ўспаміны пра яго.

Я чытаў кнігу, і ў памяці маёй міжволі ўваскрашаліся тыя далёкія, поўныя рэвалюцыйнага пафасу гады і падзеі. Прыгадаўся чэрвень 1936 года ў турме на Лукішках. Мы, палітвязні, увесь дзень з трывогай чакалі вечара. Сення павінен быць вынесены прыгавор Віленскага акруговага суда над Сяргеем Прытыцкім...

І вось недзе а шостай гадзіне з камеры ў камеру пабегла марзянкай-маланкай жахлівая вестка:

— Кара смерцю...

Я сядзеў тады разам з Валянцінам Таўлаем. Дазнаўшыся аб смяротным прыгаворы, мы не ведалі, што сказаць адзін аднаму. Нацяліся нашы нервы, сціснуліся сэрцы. Ніхто з нас, вядома, не чакаў літасці ад панскага суда. Але вестка гэтая страсянула кожнага палітвязня.

Прыгадаўся студзеньскі дзень, калі Сяргей Прытыцкі ў зале таго ж Віленскага акруговага суда стрэламі з двух рэвальвераў параніў небяспечнага правакатара. Ён зрабіў гэта на вачах у пракурора, суддзяў, паліцыі.

Ні я, ні Таўлай не былі знаёмыя з Прытыцкім, але мы разумелі, адчувалі, што ў гэтага чалавека мужнае сэрца, што ён свой, родны.

Пасля ўжо мы даведаліся, як усё адбылося. Атрымаўшы даручэнне забіць правакатара, Прытыцкі раніцай 27 студзеня пайшоў у суд. Пакутліва цягнуліся мінуты. Толькі а трэцяй гадзіне старшыня суда аб'явіў:

— Запрасіце сведку Якава Стральчука.

Адчыніліся дзверы кабінета пракурора, і адтуль выйшаў ён — правакатар. Пацямнела ў вачах у Прытыцкага. Першы раз у жыцці яму даводзілася страляць у чалавека. Каб не прамахнуцца і пазбегнуць непатрэбных ахвяр, ён вырашыў біць ва ўпор. Выхапіўшы з кішэняў два пісталеты, ірвануўся да правакатара. Грымнулі стрэлы. Усчалася паніка. Суддзі і пракурор палезлі пад стол. Прытыцкі паслаў яшчэ дзве кулі і, карыстаючыся разгубленасцю паліцыі, кінуўся ўцякаць. Тады толькі ачомаліся паліцыянты і пачалі страляць. Сяргей Восіпавіч упаў. У яго было дзевятнаццаць ран.

У мужнасці С. Прытыцкага, яго ахвярнасці мы, вязні, пераканаліся яшчэ раз, калі праз некалькі дзён ён прыслаў нам пісьмо з камеры смяротніка. Мы чыталі і гаварыліся, што сярод нас ёсць такія людзі. Я любіў жыццё, пісаў Прытыцкі, любіў сонца, кнігу, песню. Вельмі цяжка развітвацца з усім гэтым у дваццаць тры гады. Балюча думаць аб смерці. Але можаце быць упэўненыя, дарагія таварышы, што, калі надыдзе тая часіна, я пайду на шыбеніцу з горда ўзнятай галавой рэвалюцыянера, камуніста.

Шмат часу прайшло з тае пары. Даўно ўжо няма сярод нас Сяргея Прытыцкага. Але не гасне і ніколі не згасне светлая памяць пра чалавека, які ўсё сваё жыццё аддаў вялікай справе камунізму. Пра гэта і расказваецца ў кнізе «Жыццё, адданае народу».

Цёплую, пранікнёную прадмову да яе напісаў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі таварыш П. М. Машэраў. Ён ахарактарызаваў С. Прытыцкага як нязломнага барацьбіта за шчасце працоўных. З дзіцячых год спа-

знаўшы нялёгкую долю батрака, Сяргей Восіпавіч звязаў сваё жыццё з рэвалюцыйным рухам Заходняй Беларусі. «Мяне, — піша таварыш П. М. Машэраў, — як і ўсіх, хто меў шчасце працаваць поруч з ім, захаплялі ў Сяргею Восіпавічу яго ідэйная акрыленасць, сапраўды жалезная воля камуніста, бескампраміснага і прынцыповага ў правядзенні лініі партыі, у адстойванні агульнадзяржаўных, агульнанародных інтарэсаў. Ён быў самародкам, чалавекам самай высокай, камуністычнай пробы, загартаваным у гарніле рэвалюцыйнай барацьбы, выхаваным партыяй, Савецкай уладай».

У першым і другім раздзелах кнігі сабраны артыкулы і выступленні С. Прытыцкага. Усе яны прасякнуты непахіснай верай у вялікую ленінскую справу. Нельга без хвалявання чытаць расказ Сяргея Восіпавіча пра подзвіг у Віленскім акруговым судзе. Напярэдадні С. Прытыцкі доўга блукаў па віленскіх вуліцах з рэвальверамі ў кішэнях. Дзень быў хмурны і халодны, але ніколі Сяргей Восіпавіч так прагна не дыхаў паветрам, ніколі для яго не былі такімі прыгожымі неба і вада ў Віліі, як у той дзень. І ўсе людзі здаваліся яму незвычайна добрымі, за выключэннем той зграі шакалаў, што прывыкла жыць за кошт іншых. Далей С. Прытыцкі піша, што пасля стрэлаў у судзе, калі яго, параненага, на насілках неслі да машыны хуткай дапамогі, на Лукішскай плошчы сабраўся вялікі натоўп людзей. С. Прытыцкі прыўзняўся і крыкнуў: «Смерць правакатарам! Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя!»

Пасля былі суд, смяротны прыгавор, магутны шквал пратэстаў і барацьбы працоўных многіх краін свету за яго жыццё, у выніку чаго кара смерцю была заменена на вечную катаргу.

У кнізе апублікаваны яшчэ адзін гістарычны дакумент: палымяная прамова С. Прытыцкага на Народным Сходзе Заходняй Беларусі ў кастрычніку 1939 года. Звяртаючыся да дэпутатаў, С. Прытыцкі пытаўся: якую ж выбіраць уладу? Зала дружна адказала: «Саветы — вось наша ўлада!»

Усё гэта цяпер гісторыя, але яна і сёння хвалюе ўсіх нас.

З першых дзён вызвалення Заходняй Беларусі С. Прытыцкі стаў змагацца за ўмацаванне Савецкай улады. А калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, партыя накіроўвала яго на адказныя ўчасткі палітычнай і арганізатарскай работы на фронце і ў тыле ворага. І ўсюды ён свае сілы, багаты вопыт рэвалюцыянера-падпольшчыка, увесь жар свайго сэрца аддаваў справе перамогі над фашызмам.

Не шкадаваў С. Прытыцкі энергіі і здароўя і пасля вайны, калі трэба было аднаўляць зруйнаваныя беларускія гарады і вёскі, развіваць прамысловасць і сельскую гаспадарку. З кожным годам усё паўней раскрываўся яго талент кіраўніка, партыйнага і дзяржаўнага дзеяча, страснага прапагандыста ленінскіх ідэй. Звяртаючыся да моладзі, Сяргей Восіпавіч пісаў у адным са сваіх артыкулаў: «Не разменьвайце вашае жыццё на дробязі. Яно даецца толькі адзін раз, і яго трэба пражыць сумленна, з найбольшай карысцю для Радзімы, для свайго народа. Не шукайце лёгкага шчасця, бо гэта — недаўгавечны міраж. Самае вялікае шчасце для кожнага сумленнага чалавека — служыць народу».

З вялікай цікавасцю чытаецца трэці раздзел кнігі, дзе змешчаны ўспаміны людзей, якім давялося жыць і працаваць поруч з С. Прытыцкім.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы